**ГАРАДСКІ ПАСЁЛАК**, разнавіднасць пасёлка гарадскога тыпу, населены пункт з колькасцю жыхароў ад 2 да 10 тыс. чал., большасць з якіх заняты ў прам. вытворчасці, служачыя або члены іх сем'яў. Існуюць Г.п. аграпрам. профілю (Шаркаўшчына), турысцкага (Мір), курортнага (Нарач). Г.п. мае развітую сістэму культ.-быт. і сац. абслугоўвання насельніцтва. Асн. сферы вытворчасці — лёгкая прам-сць, харчовая, дрэваапрацоўчая, дзейнічаюць прадпрыемствы буд. матэрыялаў. Многія Г.п. Беларусі пераўтвораны з мястэчкаў. Асобныя існавалі ў складзе княстваў 11—13 ст. (Лоеў), некаторыя ўтвораны ў 20 ст. шляхам аб'яднання вёсак (Акцябрскі Гомельскай вобл.). Шмат Г.п. у розны час знаходзіліся ў валоданні магнатаў, мелі замкі (Брагін, Бялынічы, Глуск, Круглае, Мір), сядзібныя (Карэлічы, Круглае) і палацавыя комплексы (Бешанковічы, Ружаны Пружанскага р-на). Сучасная планіровачная структура Г.п. звычайна кампактная, вызначаецца гал. вуліцай, пл. і 1—2 планіровачнымі вузламі (Дрыбін, Багушэўск Сенненскага р-на, Глуск). Кампазіцыйная восьь — гал. вуліца, радзей — рака, якая падзяляе Г.п. на 2 ч. (Лёзна, Ушачы). Грамадска-адм. і гандлёвы цэнтр прадстаўлены плошчай. Жылую забудову фарміруюць 2—5-павярховыя дамы і індывід. дамы сядзібнага тыпу. У асобных Г.п. шматпавярховая забудова (Вялікая Бераставіца, Карэлічы, Круглае Ганцавіцкага р-на), створаны зоны адпачынку (Ушачы, Хоцімск, Шаркаўшчына). У 2011 у Беларусі 95 Г.п.

*Ю.Ю.Захарына.*



*Палац культуры ў гарадскім пасёлку Дрыбін.*

РЭПОЗИТОРИЙ БГПУ